УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

Аб'ект аўтарскага права

УДК: 811.161.3'42(043.3)

ДЗІГАДЗЮК
Валянціна Паўлаўна

# КАТЭГОРЫІ ПРАСПЕКЦЫІ І РЭТРАСПЕКЦЫІ Ў МАСТАЦКАЙ ПРОЗЕ У. ГНІЛАМЁДАВА

Аўтарэферат
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова

Мінск, 2023

МГПУ им. И. П. Шамякина

Работа выканана ва ўстанове адукацыі

«Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна»

**Навуковы кіраўнік:** **Чайка Наталля Уладзіміраўна**, доктар філалагічных навук, прафесар, прафесар кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

**Афіцыйныя апаненты:** **Іўчанкаў Віктар Іванавіч**, доктар філалагічных навук, прафесар, прафесар кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

**Русак Вольга Уладзіміраўна**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры беларускай філалогіі УА «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт»

**Апаніруючая арганізацыя:** УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна».

Абарона адбудзецца 12 кастрычніка 2023 года ў 15:00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый К 02.21.01 пры УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» па адрасе: 220030, г. Мінск, вул. Савецкая, 18, аўд. 482, e-mail: lingby@gmail.com; тэл. вучонага сакратара: 8 (017) 311-20-61.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка».

Аўтарэферат разасланы 12 верасня 2023 года.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый

Д. В. Дзятко

МГПУ им. И.П. Шамякина

МГПУ им. И. П. Шамякина

# УВОДЗІНЫ

Апошнім часам назіраецца ўзрастаючы інтарэс даследчыкаў да вывучэння мовы мастацкага твора, сродкаў і спосабаў рэпрэзентацыі тэкставых катэгорый. Такая ўвага вучоных тлумачыцца значным пашырэннем дыяпазону моўных і сюжэтна-кампазіцыйных маркераў катэгорый мастацкага тэксту, шматвектарнасцю актуалізацыі значэнняў праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе.

Катэгорыя часу вывучалася на працягу значнага перыяду развіцця лінгвістыкі з улікам тэарэтычных асноў і метадалагічных прынцыпаў розных мовазнаўчых школ і напрамкаў – лінгвістыкі тэксту (І. Р. Гальперын, А. В. Падучава, З. Я. Тураева), камунікатыўнага (Л. Г. Бабенка, Н. С. Болатнава, Я. У. Сідараў), функцыянальна-прагматычнага (А. У. Бандарка, А. У. Гулыга, Г. А. Золатава, М. Г. Мяркулава, Я. І. Шэндэльс), стылістычнага (М. М. Кожына, М. П. Кацюрава, Т. В. Мацвеева) кірункаў у мовазнаўстве.

Пры гэтым у беларускім мовазнаўстве адсутнічае вывучэнне тэмпаральнай прасторы, таму прадстаўленая дысертацыя з'яўляецца першым вопытам апісання рэпрэзентатыўнага дыяпазону катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў сучаснай мастацкай прозе. У дысертацыі зроблена спроба вызначыць сродкі выражэння названых катэгорый у творах У. Гніламёдава, іх тыпа- і відаўтварэнне, праспектыўныя і рэтраспектыўныя адносіны, выявіць агульныя і спецыфічныя параметры іх тыпалогіі з улікам сюжэтна-кампазіцыйных асаблівасцей мастацкай прозы аўтара.

**Актуальнасць** работы абумоўлена:

– прыналежнасцю яе да перспектыўнага і сучаснага напрамку – лінгвістыкі тэксту;

– запатрабаванасцю распрацоўкі кваліфікацыйных і класіфікацыйных параметраў для ўпарадкавання мастацкіх катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў беларускім мовазнаўстве;

– неабходнасцю кваліфікацыі тыпаў праспекцыі і рэтраспекцыі ў адпаведнасці з сюжэтна-кампазіцыйнымі асаблівасцямі раманаў У. Гніламёдава з мэтай далейшай распрацоўкі названых катэгорый у мове мастацкай прозы;

– важнасцю ўстанаўлення структурнай арганізацыі праспектыўнага і рэтраспектыўнага блокаў – колькасці кампанентаў і іх дыстрыбуцыі ў прасторы мастацкага тэксту;

– патрэбай выяўлення і сістэматызацыі логіка-семантычных адносін паміж праспектыўнымі і рэтраспектыўнымі кампанентамі, маркераў

МГПУ им. И.П. Шамякина

фарміравання праспектыўнай і рэтраспектыўнай прастор і дыяпазону мадальна-сэнсавых і камунікатыўна маркіраваных значэнняў праспектыўных структур; неабходнасцю стварыць рэпрэзентатыўны корпус катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі мастацкай прозы У. Гніламёдава.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з навуковымі праграмамі (праектамі), тэмамі.** Дысертацыйнае даследаванне выканана ў межах навуковых тэм «Слово, образ, текст в современной парадигме знаний: лингвистический, литературоведческий и дидактический аспекты» (2016–2020 гг.); «Кагнітыўна-дыскурсіўная структура мастацкага тэксту: семантыка-сінтаксічныя і лексіка-граматычныя асаблівасці» (2021–2025 гг.).

**Мэта дысертацыйнага даследавання** – выявіць сістэму моўнай рэпрэзентацыі катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. Гніламёдава.

У адпаведнасці з мэтай даследавання ставіліся і вырашаліся наступныя **задачы:**

– распрацаваць сістэму комплекснага аналізу тэкставых катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў творах У. Гніламёдава на аснове метадалагічных прынцыпаў лінгвістыкі тэксту;

– вызначыць асаблівасці моўнай рэпрэзентацыі кампазіцыйна-тэкставай і сюжэтна-кампазіцыйнай праспекцыі ў творах У. Гніламёдава, выявіць праспектыўныя адносіны і структурную арганізацыю праспектыўных кампанентаў;

– ахарактарызаваць спецыфіку выражэння адсылачнай рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. Гніламёдава, вызначыць відавы клас рэтраспектыўных адносін і структурную арганізацыю рэтраспектыўных кампанентаў;

– устанавіць віды, прыёмы, маркеры і будову кампазіцыйна-тэкставай і тэкставай сюжэтнай рэтраспекцыі ў раманах У. Гніламёдава.

**Аб'ектам** даследавання выступаюць катэгорыі праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. Гніламёдава.

**Прадмет** даследавання – моўная рэпрэзентацыя катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў творах У. Гніламёдава.

**Матэрыялам для даследавання** паслужылі арыгінальныя мастацкія творы У. Гніламёдава. Фактычны матэрыял для аналізу ажыццяўляўся прыёмам суцэльнай выбаркі. Картатэка фактычнага матэрыялу складае 1463 адзінкі

МГПУ им. И. П. Шамякина

(праспектыўныя і рэтраспектыўныя тэкставыя блокі), колькасць крыніц фактычнага матэрыялу даследавання – 7.

**Навуковая навізна** вынікаў дысертацыйнага даследавання заключаецца ў тым, што метадалагічныя прынцыпы лінгвістыкі тэксту былі верыфікаваны для аналізу катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў творах У. Гніламёдава. У выніку падобнага падыходу да аналізу быў выяўлены рэпрэзентатыўны корпус катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе, які ўключае рознаўзроўневыя адзінкі. У дысертацыі вызначаны тыпы і віды праспекцыі і рэтраспекцыі ў раманах У. Гніламёдава; зроблены аналіз і сістэматызацыя сродкаў моўнага выражэння праспектыўнай і рэтраспектыўнай прастор з улікам наступных параметраў упарадкавання: магчымасці структурна-сэнсавай дыферэнцыяцыі праспекцыі і рэтраспекцыі і іх моўнай рэпрэзентацыі, сюжэтна-кампазіцыйных і жанравых асаблівасцей мастацкіх твораў; устаноўлены логіка-семантычныя адносіны паміж праспектыўнымі і рэтраспектыўнымі кампанентамі; выяўлены значэнні камунікатыўнай і мадальна-сэнсавай маркіроўкі праспектыўных структур; апісаны прыёмы рэпрэзентацыі кампазіцыйна-тэкставай рэтраспекцыі з улікам колькаснага складу яе кампанентаў; вызначана структурная арганізацыя праспектыўных і рэтраспектыўных частак.

**Палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.**

1. Тыпалогію рэпрэзентацыі катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкіх творах У. Гніламёдава мэтазгодна будаваць на аснове тэарэтычных асноў і метадалагічных прынцыпаў лінгвістыкі тэксту. Кваліфікацыйнымі параметрамі ўпарадкавання выступаюць сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці мастацкай прозы, магчымасць моўнай рэпрэзентацыі і структурна-сэнсавай дыферэнцыяцыі названых катэгорый.

Спецыфіку моўнага выражэння катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі вызначаюць сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці твораў У. Гніламёдава, што ўплывае на маркіроўку названых значэнняў, іх тыпа- і відаўтварэнне і спосабы іх эксплікацыі ў мастацкай прасторы. Кваліфікацыйным параметрам пры сістэматызацыі катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі выступае колькасць сюжэтных ліній, якія вызначаюць дыяпазон праспектыўных і рэтраспектыўных планаў, а таксама асаблівасці сюжэта і кампазіцыі мастацкага твора, што дазваляе выдзяляць рода-відавыя класы катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі.

2. Кваліфікацыйныя прыкметы катэгорыі праспекцыі – магчымасць структурна-сэнсавай дыферэнцыяцыі і наяўнасць логіка-семантычных адносін паміж праспектыўнымі кампанентамі – дазваляюць выдзеліць у творах У. Гніламёдава рэпрэзентатыўныя тыпы катэгорыі, логіка-семантычныя



МГПУ им. И. П. Шамякина

адносіны паміж праспектыўнымі часткамі, маркеры праспектыўнага плана, значэнні камунікатыўнай і мадальна-сэнсавай маркіроўкі праспектыўных кампанентаў і іх структурную арганізацыю.

*Кампазіцыйна-тэкставы* тып праспекцыі прадстаўлены адносінамі тоеснасці, уключэння, перасячэння, неадпаведнасці, якія выдзяляюцца на аснове логіка-семантычнага ўзаемадзеяння зместу праспектыўных структур. Прамымі маркерамі тэмпаральнага плана выступаюць формы будучага часу, загаднага і ўмоўнага ладу дзеясловаў, мадальныя дзеясловы, што тлумачыцца здольнасцю названых форм утвараць часавы план. Праспектыўныя кампаненты могуць маркіравацца мадальна-сэнсавымі і камунікатыўнымі значэннямі – пажадання, намеру, меркавання, магчымасці, пабуджэння, неабходнасці *vs* прапановы, просьбы, парады, пагрозы, забароны, сцвярджэння, што абумоўлена іх прыналежнасцю да адзінак размоўнага сінтаксісу і, адпаведна, шырокім дыяпазонам адценняў значэння аналізуемых кампанентаў. Структурная рэпрэзентацыя праспектыўна маркіраванай часткі ажыццяўляецца з дапамогай сінтаксічных адзінак рознага ўзроўню.

Дыферэнцыяцыя відаў *сюжэтна-кампазіцыйнай* праспекцыі ў творах У. Гніламёдава абумоўлена ўзаемадзеяннем ключавых кампанентаў жанрава-тэматычнай арганізацыі мастацкага твора – тэмпаральным працэсуальным планам, ідэяй – і маркіруецца *імем аўтара, загалоўкам*.

3. Кваліфікацыйным параметрам упарадкавання катэгорыі рэтраспекцыі ў раманах У. Гніламёдава выступаюць яе шырокі рэпрэзентатыўны дыяпазон і сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці твораў пісьменніка, што дазваляе выдзеліць адпаведныя тыпы, віды і маркеры катэгорыі рэтраспекцыі.

Характар узаемадзеяння паміж зместам рэтраспектыўнай і перадрэтраспектыўнай частак прадвызначае фарміраванне адносін паміж названымі структурамі – *тоеснасці,* пры якіх назіраецца поўная зместавая ідэнтычнасць у межах адной сюжэтнай лініі, і *ўключэння*, якія характарызуюцца частковым супадзеннем падзей. У адпаведнасці з дыстрыбуцыяй кампанентаў адносна сюжэтнай лініі твора *адсылачная рэтраспекцыя* падзяляецца на кантактную і дыстантную.

*Лексіка-граматычнымі* маркерамі рэтраспектыўнага плана выступаюць лексічны паўтор, сінанімія, лексемы з указаннем на час, займеннікі, лексемы, што змяшчаюць рэтраспектыўную інфармацыю або адсыл да загалоўка тэксту. *Граматычнымі* маркерамі рэтраспекцыі з’яўляюцца формы дзеепрыметніка.

*Структурны* рэпрэзентатыўны дыяпазон рэтраспектыўных кампанентаў прадстаўлены складаназлучанымі, складаназалежнымі, бяззлучнікавымі сказамі, сказамі камбінаванай будовы; канструкцыямі эліптычнымі,

МГПУ им. И.П. Шамякина

рэдукаванымі, з сінтаксічнай непаўнатой і імпліцытнай семантыкай; інтэртэкставымі ўключэннямі; далучальнымі канструкцыямі, суадноснымі з членамі сказа і з прэдыкатыўнымі часткамі.

4. Адметнасцю *кампазіцыйна-тэкставай* рэтраспекцыі з'яўляецца пазасюжэтны спосаб увядзення рэтраспектыўнай інфармацыі. З улікам асаблівасцей маркіроўкі кампазіцыйна-тэкставай рэтраспекцыі і колькаснага складу кампанентаў магчыма выдзяленне наступных *прыёмаў* рэпрэзентацыі кампазіцыйна-тэкставай рэтраспекцыі – намінацыі рэтраспектыўных падзей, іх інфармацыйнае дапаўненне, супастаўленне і параўнанне, прыёму прамой актуалізацыі мінулых падзей, увядзенне ў сюжэт мастацкага твора імён вядомых дзеячаў, іх цытат, гістарычных падзей і фактаў, якія імпліцытна актуалізуюць зрух у часавы план мінулага.

Рэпрэзентацыя *тэкставай сюжэтнай* рэтраспекцыі абумоўлена тыпам сюжэта і прадстаўлена структурна-кампазіцыйным падзелам на главы. Маркерамі тэкставай сюжэтнай рэтраспекцыі выступаюць лексіка-граматычныя сродкі – лексемы з рэтраспектыўнай семантыкай.

Для *тэкставай сюжэтнай рэтраспекцыі* характэрна яе выражэнне на ўзроўні кампазіцыі мастацкага твора, што падразумявае супастаўленне асноўнага плана апавядання з базісным часам. Функцыянальна-сэнсавы дыяпазон названага тыпу рэтраспекцыі абумоўлены кампазіцыйнымі асаблівасцямі твораў У. Гніламёдава і спецыфікай лексіка-граматычнага выражэння катэгорыі – лінейнай кампазіцыяй мастацкага твора, лінейна-паралельным і лінейным з экскурсамі сюжэтам раманаў.

**Асабісты ўклад саіскальніка вучонай ступені ў выніікі дысертацыі з аддзяленнем іх ад суаўтараў сумесных даследаванняў і публікацый.** У дысертацыі тэарэтычныя палажэнні і вывады, матэрыялы даследавання з'яўляюцца вынікам самастойнай працы саіскальніка.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**. Асноўныя вынікі і тэарэтычныя палажэнні дысертацыі былі прадстаўлены і абмеркаваны на наступных навуковых канферэнцыях: «Нацыянальна-культурны кампанент у літаратурнай і дыялектнай мове» (Брэст, 2019 г.); «XVI Машеровские чтения» (Віцебск, 2022 г.); «Актуальные проблемы романо-германской филологии и методики преподавания иностранных языков» (Гомель, 2022 г.); «Пинские чтения» (Пінск, 2022 г.); «Раманаўскія чытанні – XVI» (Магілёў, 2022 г.); «Трынаццатыя Танкаўскія чытанні» (Мінск, 2022 г.); «Шаг в науку: проблемы, поиски, решения» (Гомель, 2022 г.).

Матэрыялы і вынікі даследавання выкарыстаны пры выкладанні дысцыплін «Беларускае мовазнаўства», «Сучасная беларуская літаратурная

МГПУ им. И. П. Шамякина

мова», «Стылістыка беларускай мовы», «Філалагічны аналіз тэксту», «Камунікатыўная лінгвістыка і тэксталогія» на філалагічным факультэце ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», пра што сведчыць акт аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання (акт укаранення ад 29.03.2023 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыйнага даследавання.**

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыі прадстаўлены ў 14 публікацыях, з якіх 7 артыкулаў у рэцэнзаваных навуковых часопісах, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь (3,16 аўт. арк.), 3 артыкулы ў зборніках навуковых прац і навуковых часопісах (0,6 аўт. арк.), 4 публікацыі ў зборніках навуковых і навукова-метадычных міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцый (0,9 аўт. арк.). Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 4,66 аўт. арк.

**Структура і аб'ём дысертацыйнага даследавання.** Дысертацыя змяшчае ўводзіны, агульную характарыстыку работы, тры главы, заключэнне, бібліяграфічны спіс, які ўключае спіс выкарыстаных крыніц (198 пазіцый), спіс публікацый (14 пазіцый), спіс крыніц даследавання (7 пазіцый), дадаткі (1463 рэтраспектыўныя і праспектыўныя тэкставыя блокі). Асноўны тэкст дысертацыі займае 114 старонак, бібліяграфічны спіс – 20 старонак, дадаткі А–Г – 319 старонак. Агульны аб'ём даследавання – 453 старонкі.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Ва **ўводзінах** абгрунтоўваецца выбар тэмы даследавання, паказваецца яе актуальнасць, праводзіцца кароткі агляд кірункаў вывучэння мастацкага часу і вызначаецца кола пытанняў, што патрабуюць спецыяльнага даследавання.

У агульнай характарыстыцы працы раскрываецца сувязь дысертацыі з буйнымі навуковымі праграмамі, вызначаюцца мэта і задачы даследавання, навуковая навізна, фармулююцца палажэнні, што выносяцца на абарону, адлюстроўваюцца асабісты ўклад саіскальніка, апублікаванасць вынікаў даследавання і іх апрабацыя, характарызуецца структура і аб'ём работы.

**У першай главе «Катэгорыі праспекцыі і рэтраспекцыі ў мовазнаўстве»** прадстаўлена сістэматызацыя асноўных напрамкаў вывучэння катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў мовазнаўстве, праведзены распрацоўка і тэарэтычнае абгрунтаванне агульнай канцэпцыі даследавання праспектыўных і рэтраспектыўных форм дыскантынуума.

Раздзел 1.1 **«Гісторыя вывучэння праспекцыі і рэтраспекцыі ў мовазнаўстве»** змяшчае аналітычны агляд даследаванняў мастацкага часу ў



МГПУ им. И.П. Шамякина

працах прадстаўнікоў розных лінгвістычных школ і напрамкаў: лінгвістыкі тэксту (І. Р. Гальперын, Т. В. Мацвеева, З. Я. Тураева), функцыянальнага (Н. В. Брускова, Л. Я. Зайцава, М. Г. Мяркулава, Л. Н. Фёдарава, І. В. Ціўяева), кагнітыўнага (В. А. Маслава, А. С. Кубракова, Ю. С. Сцяпанава), семантычнага (Н. У. Брускова, Л. Н. Фёдарава, Я. А. Чыгоўская). Аналіз розных метадалагічных прынцыпаў мовазнаўчых кірункаў дазволіў вызначыць статус катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў мовазнаўстве і распрацаваць шляхі і спосабы іх даследавання.

У раздзеле 1.2 **«Метадалагічныя прынцыпы даследавання катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкіх творах У. Гніламёдава»** абгрунтоўваецца выбар параметраў упарадкавання моўнай рэпрэзентацыі праспекцыі і рэтраспекцыі, іх кваліфікацыйныя і класіфікацыйныя ўласцівасці; распрацоўваюцца метадалагічныя прынцыпы і тэарэтычныя асновы іх даследавання; прапануецца спосаб сістэматызацыі тыпаў, відаў, значэнняў, адносін, прыёмаў, маркераў і сродкаў выражэння праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. Гніламёдава.

**Другая глава «Катэгорыя праспекцыі»** змяшчае аналіз спосабаў моўнай рэпрэзентацыі катэгорыі праспекцыі, класіфікацыю яе тыпаў, адносін паміж праспектыўнымі кампанентамі, маркераў і структурную арганізацыю праспектыўных блокаў у мастацкіх творах У. Гніламёдава.

У раздзеле 2.1 **«Кампазіцыйна-тэкставая праспекцыя»** прадстаўлены лексіка-граматычныя, камунікатыўныя і мадальна-сэнсавыя маркеры праспекцыі, логіка-семантычныя адносіны паміж праспектыўнымі кампанентамі і іх структурная арганізацыя (рысунак 1).

МГПУ им. И.П. Шамякина




Рысунак 1 – Кампазіцыйна-тэкставая праспекцыя ў творах У. Гніламёдава

Праспектыўныя адносіны вылучаліся на аснове ўзаемадзеяння паміж сэнсавымі аб'ёмамі праспектыўных кампанентаў. Напрыклад, адносіны тоеснасці падразумяваюць поўнае супадзенне запланаваных падзей і іх рэалізацыю: – *Нічога ў свеце няма больш праўдзівага за карты.* ***Вернецца ён (Васіль) з вайны*** *і яшчэ доўга жыць будзеце, толькі …* («Пасля вайны», с. 20). <…> [*Пачалі вяртацца франтавікі. <…>* ***Васіль вярнуўся*** *ў жніўні*] («Пасля вайны», с. 77).

Сістэматызацыя праспектыўных кампанентаў ажыццяўляецца таксама з улікам іх мадальна-сэнсавай маркіроўкі (рысунак 2). Праспектыўны кампанент – ***Яшчэ каб гадзіннік прыдбаць,*** *дык быў бы ўжо зусім як амерыканец* («Уліс з Прускі», с. 137) мае мадальна-сэнсавае значэнне *пажадання,* якое рэалізуецца ў постпраспектыўнай структуры: <…> [*Першы* ***набыў гадзіннік*** *Цімоша*] («Уліс з Прускі», с. 140).

МГПУ им. И. П. Шамякина




Рысунак 2 – Мадальна-сэнсавыя значэнні праспектыўных кампанентаў у мастацкай прозе У. Гніламёдава

Пры класіфікацыі праспектыўных кампанентаў таксама ўлічвалася іх камунікатыўная маркіроўка (рысунак 3). Кампанент – *Ведаеце, што я вам параю: **едзьце** ў Гомель – там **можна будзе прадаць і каня з возам**, там людзі купяць* («Расія», с. 93). <…> [*А **яны паехалі далей**. <…> Вайсковая камісія **заплаціла за Цыганчыка і за воз***] («Расія», с. 101) маркіраваны значэннем *прапановы.*




Рысунак 3 – Камунікатыўна маркіраваныя значэнні праспектыўных кампанентаў у мастацкай прозе У. Гніламёдава

Раздзел 2.2 **«Сюжэтна-кампазіцыйная праспекцыя»** змяшчае аналіз рэпрэзентацыі катэгорыі праспекцыі на ўзроўні мастацкага тэксту. Маркерамі сюжэтна-кампазіцыйнай праспекцыі выступаюць імя аўтара, загаловак, які выражаны ўласнымі імёнамі, назоўнікамі са значэннем часу, месца, лексемамі з варыятыўнай семантыкай. Напрыклад, намінацыя галоўнага персанажа актуалізуецца ўжываннем уласнага імя ў рамане «Уліс з Прускі».

**Трэцяя глава** дысертацыі **«Катэгорыя рэтраспекцыі»** складаецца з трох раздзелаў і змяшчае аналіз рэпрэзентацыі катэгорыі рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. Гніламёдава.

Раздзел 3.1 **«Адсылачная рэтраспекцыя»** ўключае кваліфікацыю і класіфікацыю з’яў адсылачнай рэтраспекцыі ў раманах У. Гніламёдава. Сістэматызацыя моўных фактаў праводзілася з улікам часавай аддаленасці

МГПУ им. И.П. Шамякина

паміж рэтраспектыўна абумоўленымі падзеямі, дыстрыбуцыі рэтраспектыўных кампанентаў і логіка-семантычных адносін паміж імі, а таксама сродкаў рэпрэзентацыі рэтраспектыўнага плана раманаў (рысунак 4).




Рысунак 4 – Адсылачная рэтраспекцыя ў творах У. Гніламёдава

Тыпалогія рэтраспектыўных адносін пабудавана на характары ўзаемадзеяння тэмпаральна абумоўленых частак тэксту. Напрыклад, дубліраванне кампанентаў у перадрэтраспектыўнай і рэтраспектыўнай структурах дазваляе сфарміраваць часавы адсыл да мінулых падзей: [– ***Вокны мыць?*** *– перапытаў Лявонка ў перакладчыка і падумаў: «У нас жа гэта жанчыны робяць...». <...>* ***(Лявонку) Давялося згадзіцца***] («Уліс з Прускі», с. 131). *<...> – Дамы там велічэзныя: і на тры, і на пяць, і на сорак паверхаў! Да хмар!* ***Лявон ... вокны мыў...*** («Расія», с. 22).

Моўная рэпрэзентацыя адсылачнай рэтраспекцыі падразумявае лексічны паўтор кампанентаў, сінанімію, уключэнне лексем са значэннем абагульнення і ўказання на рэтраспектыўную працэсуальнасць, ужыванне прыслоўяў, прыметнікаў і займеннікаў з указаннем на час.

У раздзеле 3.2 **«Кампазіцыйна-тэкставая рэтраспекцыя»** прадстаўлены віды, прыёмы і сродкі рэпрэзентацыі кампазіцыйна-тэкставай рэтраспекцыі ў раманах У. Гніламёдава (рысунак 5). Кваліфікацыя з’яў кампазіцыйна-тэкставай рэтраспекцыі праводзілася з улікам новай і ўжо вядомай для чытача рэтраспектыўнай інфармацыі, спосабаў яе ўвядзення ў структуру мастацкага твора і моўных сродкаў рэпрэзентацыі часавых падзей. Напрыклад, ***Успомніўся выпадак з дзяцінства****. Неяк ён прынёс Кастантаму кошык свежых грыбоў, якіх назбіраў у Бярэзіне. Грыбы добрыя – адны баравікі ды падасінавікі. Думаў, заплаціць капейчыну якую. Кастанты глянуў на кошык і ажно языком зацмокаў. Але ўголас сказаў: «Песляччо!» Гэтак у Прусцы казалі на старыя,*

МГПУ им. И.П. Шамякина

*раскіслыя грыбы. <…> Усё гэта* ***ўсплыло ў памяці****, калі ён пераступіў парог ураднікавага дома* («Уліс з Прускі», с. 120).




Рысунак 5 – Кампазіцыйна-тэкставая рэтраспекцыя ў творах У. Гніламёдава

Раздзел 3.3 **«Тэкставая сюжэтная рэтраспекцыя»** прысвечаны вывучэнню моўнай рэпрэзентацыі сюжэтнай рэтраспекцыі. Спецыфічнымі сродкамі пераходу ў рэтраспектыўны сюжэт выступаюць моўныя адзінкі з тэмпаральнай семантыкай і лексіка-граматычныя сродкі – прыслоўі і лексічныя адзінкі са значэннем часу, якія з'яўляюцца ініцыятарамі пераходу да асноўнай рэтраспектыўна маркіраванай часткі мастацкага тэксту: *Чым даўжэй* ***ён*** *жыў, тым часцей* ***успамінаў той выпадак****, у самым дзяцінстве, на прускаўскай вуліцы.* ***Тады ён быў*** *яшчэ* ***не Лявонам, а Лявонкам*** *– падлеткам, што нядаўна толькі скончыў вясковую школку* <…> («Уліс з Прускі», с. 1). Асаблівасцю рэпрэзентацыі тэкставай сюжэтнай рэтраспекцыі ў творах У. Гніламёдава таксама з'яўляецца рэалізацыя падзей у адным часавым плане з рэтраспектыўнымі экскурсамі.

Мастацкая тэмпаральная прастора твораў У. Гніламёдава ажыццяўляецца рознымі спосабамі: наяўнасцю асноўнага рэтраспектыўнага сюжэта ўнутры базіснага плана, актуалізацыяй асноўнага сюжэтнага плана з унутранымі рэтраспектыўнымі спасылкамі, рэалізацыяй рэтраспектыўных адсылак паміж творамі, звязанымі адной сюжэтнай лініяй.

МГПУ им. И. П. Шамякина

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

## Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Кваліфікацыя і сістэматызацыя катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў творах У. Гніламёдава заснаваны на метадалагічных прынцыпах лінгвістыкі тэксту. Названая тэорыя прадвызначае наяўнасць універсальных і спецыфічных параметраў для выяўлення і ўпарадкавання моўных фактаў, характарызуе аб'ект лінгвістыкі паводле спосабаў эксплікацыі праспектыўнай і рэтраспектыўнай прастор. Падобная метадалогія дазваляе ў поўнай меры выявіць універсальныя прыкметы катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкіх творах у цэлым і іх спецыфічныя асаблівасці ў раманах У. Гніламёдава ў прыватнасці.

Універсальныя параметры сістэматызацыі аналізуемых катэгорый выяўляюцца ў магчымасці аб'яднаць усе значэнні, маркеры, адносіны і прыёмы праспекцыі і рэтраспекцыі ў адзін вялікі клас адзінак на базе агульных заканамернасцей іх функцыянавання. У аснову інтэграцыі структурна-сэнсавай рэпрэзентацыі праспекцыі і рэтраспекцыі пакладзены ўніверсальныя параметры класіфікацыі: наяўнасць праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкіх творах, магчымасць выражэння катэгорый моўнымі сродкамі, утварэння рода-відавога класа значэнняў праспекцыі і рэтраспекцыі ў творах У. Гніламёдава.

Для выяўлення спецыфікі рэпрэзентацыі катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў аналізуемых творах выкарыстоўваліся сюжэтна-кампазіцыйныя і жанрава-тэматычныя асаблівасці мастацкай прозы, якія ўплываюць на тыпа- і відаўтварэнне праспекцыі і рэтраспекцыі і іх значэнняў, прыёмаў і маркераў іх рэпрэзентацыі. Яны прадстаўлены відам і тыпам сюжэта, кампазіцыяй твора, колькасцю сюжэтных ліній і персанажаў.

Колькасць сюжэтных ліній, іх паслядоўнасць, шматвектарнасць, складанасць і разгалінаванасць уплываюць на дыяпазон праспектыўных і рэтраспектыўных планаў.

Асаблівасці сюжэта і кампазіцыі мастацкага твора дазваляюць аб'яднаць значэнні праспекцыі і рэтраспекцыі ў рода-відавыя класы з улікам тыпу сюжэта (лінейнага з экскурсамі, лінейна-паралельнага) і ступені яго экспрэсіі (статычнай, дынамічнай), наяўнасці / адсутнасці элементаў кампазіцыі (падзелу на главы, дыялогаў, маналогаў), а таксама тыпу кампазіцыі (лінейнага).

Павышаны ўзровень экспрэсіі мастацкага твора прадуцыруе дыяпазон сюжэтных ліній, што ўплывае на колькасную маркіроўку прыёмаў і значэнняў

МГПУ им. И. П. Шамякина

праспектыўнай і рэтраспектыўнай прастор (маналогі, дыялогі, падзеі, фрагменты тэксту з успамінамі, разважаннямі) [3; 5; 8].

2. У ходзе даследавання вызначаны 2 тыпы праспекцыі, 4 віды логіка-семантычных адносін паміж праспектыўнымі кампанентамі, 5 лексіка-граматычных маркераў і 2 сюжэтна-кампазіцыйныя маркеры праспекцыі, 6 значэнняў камунікатыўнай і 6 мадальна-сэнсавай маркіроўкі праспектыўных кампанентаў і іх структурная арганізацыя (было прааналізавана 308 праспектыўных блокаў) (дадаткі А–Б).

На аснове функцыянальна-сэнсавых параметраў упарадкавання катэгорый мастацкага тэксту вылучаны два тыпы праспекцыі – кампазіцыйна-тэкставая і сюжэтна-кампазіцыйная.

Рэпрэзентацыя **кампазіцыйна-тэкставай** праспекцыі ажыццяўляецца з дапамогай адносін паміж тэкставымі кампанентамі. Дадзены рэпрэзентатыўны клас уключае праспекцыю, паміж кампанентамі якой зафіксаваны логіка-семантычныя адносіны тоеснасці, уключэння, перасячэння, неадпаведнасці. Характэрнай асаблівасцю адносін тоеснасці і ўключэння з’яўляецца канстантны характар сюжэтнай лініі. Спецыфікай праспектыўных адносін перасячэння і неадпаведнасці выступае пераменны характар сюжэта мастацкага твора.

*Прамымі маркерамі* праспектыўнай прасторы выступаюць формы будучага часу і загаднага ладу дзеясловаў, мадальныя дзеясловы. Зрэдку назіраюцца выпадкі маркіроўкі часавага плана формамі дзеепрыметніка і ўмоўнага ладу дзеяслова.

У ходзе даследавання выяўлена камунікатыўная і мадальна-сэнсавая маркіроўка праспектыўных кампанентаў, якая прадстаўлена значэннямі пажадання, намеру, меркавання, магчымасці, пабуджэння, неабходнасці vs просьбы, прапановы, парады, забароны, пагрозы, сцвярджэння.

*Структурная арганізацыя* праспектыўна маркіраваных кампанентаў прадстаўлена рознымі тыпамі складаных сказаў; далучальнымі канструкцыямі, суадноснымі з членамі сказа і са сказамі – з далучальна-супастаўляльнымі, далучальна-заключальнымі, далучальна-мэтавымі, далучальна-прычыннымі часткамі; канструкцыямі з сінтаксічнай непаўнатой, рэдукцыяй і эліпсісам, з імпліцытнай семантыкай.

Кваліфікацыя **сюжэтна-кампазіцыйнай** праспекцыі абумоўлена ключавымі кампанентамі жанрава-тэматычнай арганізацыі мастацкага твора – тэмпаральным працэсуальным планам, ідэяй – і маркіруецца імем аўтара, загалоўкам.

Узаемадзеянне кампазіцыйных і сюжэтных складнікаў на імпліцытным узроўні дазваляе *імені аўтара* праецыраваць тэматыку і жанравыя асаблівасці

МГПУ им. И.П. Шамякина

на суб’ектыўна-чытацкі план успрыняцця інфармацыі. Падобная магчымасць абумоўлена функцыямі імені аўтара ў структуры мастацкага твора – камунікатыўнай, якая дазваляе паведамляць пра падзеі або сэнсава ўключаць іх у змест рамана («Расія», «Валошкі на мяжы»), і ўказальнай, што дазваляе спраецыраваць будучыя падзеі («Вайна»).

*Загаловак* выступае маркерам праспекцыі дзякуючы яго значнаму функцыянальнаму дыяпазону ў мастацкім тэксце. Тэкстаўтвараючая функцыя дазваляе «спрагназаваць» сюжэт твора, а значыць, і часавыя лініі ў ім («Вяртанне»); функцыя кампазіцыйнай арганізацыі дае магчымасць спраецыраваць праспектыўны план з загалоўка на структуру мастацкага твора («Уліс з Пruскі»); функцыя жанравай арганізацыі спрыяе ўтварэнню часавай прасторы паміж кампанентамі (загалоўкам і тэкстаструктурай) на аснове іх сэнсавага ўзаемадзеяння («Пасля Вайны») [6; 10; 13].

3. Даследаванне катэгорыі рэтраспекцыі ў творах У. Гніламёдава заснавана на ўніверсальных параметрах яе тыпалогіі – наяўнасці названай катэгорыі ў мастацкай прозе і магчымасці яе маркіроўкі рознаўзроўневымі моўнымі адзінкамі. Спецыфічнымі параметрамі ўпарадкавання выступаюць асаблівасці фармальна-зместавай арганізацыі мастацкай прозы У. Гніламёдава – лінейны тып кампазіцыі і сюжэта, якія абумоўліваюць тыпа- і відаўтварэнне значэнняў рэтраспекцыі, фарміраванне логіка-семантычных адносін паміж рэтраспектыўнымі кампанентамі, а таксама іх маркіроўку, прыёмы і спосабы рэпрэзентацыі.

У ходзе даследавання былі выяўлены 3 тыпы і 4 віды рэтраспекцыі, 2 віды адносін паміж рэтраспектыўнымі структурамі, 6 прыёмаў кампазіцыйна-тэкставай рэтраспекцыі ў творах У. Гніламёдава (прааналізавана 1155 рэтраспектыўных тэкставых блокаў) (дадаткі В–Г). На аснове спосабаў увядзення рэтраспектыўнай інфармацыі ў сюжэт мастацкага твора выдзелена рэтраспекцыя *адсылачная, кампазіцыйна-тэкставая і тэкставая сюжэтная.*

**Адсылачная рэтраспекцыя** падзяляецца на *кантактную* і *дыстантную,* што абумоўлена дыстрыбуцыяй рэтраспектыўнай і перадрэтраспектыўнай частак адносна часавай сюжэтнай лініі твора. Характар узаемадзеяння зместу рэтраспектыўнай і перадрэтраспектыўнай структур прадвызначае фарміраванне *адносін тоеснасці,* для якіх уласціва поўная зместавая ідэнтычнасць у межах адной сюжэтнай лініі, і *ўключэння*, адметнасць якіх праяўляецца ў частковым супадзенні падзей. Падзеі, што ахоплены адносінамі тоеснасці і ўключэння, знаходзяцца ў прасторы адной сюжэтнай лініі; іх рэпрэзентацыя ажыццяўляецца эксплiцытным і імпліцытным спосабамі.

МГПУ им. И.П. Шамякина

Рэпрэзентацыя рэтраспекцыі ажыццяўляецца на *лексіка-граматычным* узроўні і прадстаўлена наступнымі спосабамі і сродкамі: лексічным паўторам, сінаніміяй, лексемамі з указаннем на час (прыслоўямі, прыметнікамі), займеннікамі (азначальным *усё,* адмоўным *нічога*), лексемамі, што змяшчаюць рэтраспектыўную інфармацыю, яе абагульненне або адсыл да загалоўка тэксту; *марфалагічнымі:* формамі дзеепрыметніка. Рэтраспектыўныя кампаненты ў працэсе функцыянавання набываюць *структуру* складаназлучаных, складаназалежных, бяззлучнікавых сказаў, сказаў камбінаванай будовы, канструкцый з сінтаксічнай непаўнатой і імпліцытнай семантыкай, рэдукаваных, эліптычных, далучальных і ўстаўных канструкцый [2; 4; 9; 14].

4. Відаўтварэнне **кампазіцыйна-тэкставай** рэтраспекцыі абумоўлена характарам перадрэтраспектыўнай інфармацыі і ўяўляе сабой новыя факты аб мінулым, што ў сюжэце твора не згадваліся. У ходзе даследавання выдзелены 2 віды кампазіцыйна-тэкставай рэтраспекцыі – пазатэкставая і фактычная (было прааналізавана 580 адзінак) (дадатак Г). Улічваючы колькасны склад кампазіцыйна-тэкставай рэтраспекцыі (аднакампанентны) і асаблівасці маркіроўкі, былі выдзелены прыёмы яе рэпрэзентацыі – намінацыя рэтраспектыўных падзей, інфармацыйнае дапаўненне фактаў, супастаўленне і параўнанне падзей, прыём прамой актуалізацыі мінулых падзей, прычынна-выніковыя адносіны паміж рэтраспектыўнымі падзеямі.

Маркерамі кампазіцыйна-тэкставай рэтраспекцыі выступаюць сродкі *лексіка-граматычныя:* лексемы з указаннем на час (прыслоўі, прыметнікі), словазлучэнні (назоўнік з назоўнікам, лічэбнікам, займеннікам), лексічныя адзінкі рэтраспектыўнага значэння (антрапонімы, намінацыі гістарычных падзей, фактаў); *марфалагічныя:* часавыя формы дзеяслова, формы дзеепрыметніка, формаўтваральная часціца *бывала*. *Структурная арганізацыя* кампанентаў кампазіцыйна-тэкставай рэтраспекцыі прадстаўлена сказамі складаназалежнымі, камбінаванымі, бяззлучнікавымі, канструкцыямі з сінтаксічнай непаўнатой і імпліцытнай семантыкай, эліпсісам, параўнальнымі канструкцыямі, далучальнымі канструкцыямі, інтэртэкставымі ўключэннямі.

Рэпрэзентацыя **тэкставай сюжэтнай рэтраспекцыі** ажыццяўляецца на ўзроўні кампазіцыі тэксту на аснове яе супастаўлення з базісным часам. Дадзены тып рэтраспекцыі ўяўляе сабой закончаныя ўрыўкі апавядання са сваімі ўнутранымі часавымі зрухамі. Вызначэнне тэкставай сюжэтнай рэтраспекцыі абумоўлена тыпам кампазіцыі твораў У. Гніламёдава – лінейным. Моўная рэпрэзентацыя тэкставай сюжэтнай рэтраспекцыі прадстаўлена лексіка-граматычнымі спосабамі і сродкамі – лексемамі з рэтраспектыўнай семантыкай, маркіроўкай пачатку твора лексемамі са значэннем часу – акалічнасцямі і

МГПУ им. И.П. Шамякина

прыслоўямі часу. Спецыфіка рэпрэзентацыі тэкставай сюжэтнай рэтраспекцыі праяўляецца ў арганізацыі часавай кампазіцыі твораў – наяўнасці асноўнага рэтраспектыўнага сюжэта ўнутры базіснага плана, у актуалізацыі асноўнай рэтраспектыўна выражанай сюжэтнай лініі з унутранымі рэтраспектыўнымі спасылкамі, у адзінстве сюжэтнай лініі, а значыць і ў рэтраспектыўнай узаемаабумоўленасці сюжэта цыкла раманаў [1; 7; 11; 12].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Распрацаваныя крытэрыі аналізу, прынцыпы класіфікацыі тэкставых катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі могуць быць выкарыстаны пры даследаванні і аналізе іншых тэкстаструктур, якія з’яўляюцца сродкам актуалізацыі мастацкіх катэгорый мадальнасці, лакатыўнасці, асобы і інш.

Звесткі, атрыманыя ў ходзе даследавання, могуць быць узяты за аснову пры далейшым вывучэнні катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў розных тыпах тэкстаў, розных жанрах мастацкай літаратуры.

Вынікі і асноўныя палажэнні дысертацыі, сістэматызаваны і інтэрпрэтаваны фактычны матэрыял знойдуць прымяненне пры вывучэнні праблем дыферэнцыяцыі і інтэрпрэтацыі катэгорый мастацкага тэксту, пры стварэнні граматыкі беларускай мовы.

Матэрыялы дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны пры выкладанні дысцыплін «Беларускае мовазнаўства», «Сучасная беларуская літаратурная мова», «Стылістыка беларускай мовы», «Філалагічны аналіз тэксту», «Камунікатыўная лінгвістыка і тэксталогія»; пры падрыхтоўцы дыпломных работ, магістарскіх і кандыдацкіх дысертацый.

МГПУ им. И. П. Шамякина

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ

## Артыкулы ў навуковых рэцэнзуемых часопісах

1. Дзігадзюк, В. П. Катэгорыя рэтраспекцыі ў мастацкім тэксце: лексічныя сродкі выражэння / В. П. Дзігадзюк // Вес. Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 1. Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2019. – № 3 (101). – С. 136–140.

2. Дзігадзюк, В. П. Адсылачная рэтраспекцыя і яе рэпрэзентацыя ў мастацкім тэксце / В. П. Дзігадзюк // Вес. Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 1. Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2020. – № 2 (104). – С. 72–75.

3. Дзігадзюк, В. П. Катэгорыя рэтраспекцыі ў мовазнаўстве / В. П. Дзігадзюк // Изв. Гомел. гос. ун-та. Гуманит. науки. – 2021. – № 1 (124). – С. 74–79.

4. Дзігадзюк, В. П. Рэтраспекцыя ў мастацкай прозе Уладзіміра Гніламёдава / В. П. Дзігадзюк // Весн. Мазыр. дзярж. пед. ун-та. – 2022. – № 2 (60). – С. 108–112.

5. Дзігадзюк, В. П. Катэгорыі праспекцыі і рэтраспекцыі ў прозе У. Гніламёдава / В. П. Дзігадзюк // Вестн. Минск. гос. лингв. ун-та. Сер. 1. Филология. – 2022. – № 6 (121). – С. 116–124.

6. Дзігадзюк, В. П. Рэпрэзентацыя катэгорыі праспекцыі ў творах У. Гніламёдава / В. П. Дзігадзюк // Вес. Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 1. Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2022. – № 4. – С. 109–114.

7. Дзігадзюк, В. П. Структурна-сэнсавая арганізацыя рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. В. Гніламёдава / В. П. Дзігадзюк // Журн. Белорус. гос. ун-та. Филология. – 2023. – № 1. – С. 100–108.

## Артыкулы ў навуковых зборніках

8. Дзігадзюк, В. П. Катэгорыя праспекцыі ў мастацкім тэксце / В. П. Дзігадзюк // Нацыянальна-культурны кампанент у літаратурнай і дыялектнай мове : зб. навук. арт. / Брэсц. дзярж. ун-т ; рэдкал. : С. Ф. Бут-Гусаім, Л. В. Леванцэвіч, Т. А. Кісель. – Брэст, 2019. – С. 66–70.

9. Дзігадзюк, В. П. Рэтраспекцыя з адносінамі тоеснасці ў прозе У. Гніламёдава / В. П. Дзігадзюк // Трынаццатыя Танкаўскія чытанні : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал. : В. Д. Старычонак (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2022. – С. 83–87.

10. Дзігадзюк, В. П. Структурная арганізацыя праспектыўных канструкцый у прозе У. Гніламёдава / В. П. Дзігадзюк // Молодежный филологический вестник : сб. науч. ст. / Гомел. гос. ун-т, Представительство Россотрудничества в Респ. Беларусь, Рос. центр науки и культуры в Гомеле ;

МГПУ им. И.П. Шамякина

редкол. : Е. И. Тимошенко (отв. ред.) [и др.]. – Гомель, 2022. – Вып. 2. – С. 51– 54.

**Матэрыялы канферэнцый**

11. Дзігадзюк, В. П. Інфармацыйна-дапаўняльная рэтраспекцыя ў мастацкіх творах У. Гніламёдава / В. П. Дзігадзюк // Пинские чтения : материалы междунар. науч.-практ. конф., г. Пинск, 15–16 сент. 2022 г. / Полес. гос. ун-т ; редкол. : В. И. Дунай [и др.]. – Пинск, 2022. – С. 454–456.

12. Дзігадзюк, В. П. Прыёмы актуалізацыі кампазіцыйна-тэкставай рэтраспекцыі ў прозе У. Гніламёдава / В. П. Дзігадзюк // XVI Машеровские чтения : материалы междунар. науч.-практ. конф. студентов, аспирантов и молодых ученых, Витебск, 21 окт. 2022 г. : в 2 т. / Витеб. гос. ун-т ; редкол. : Е. Я. Аршанский (гл. ред.) [и др.]. – Витебск, 2022. – Т. 2. – С. 168–170.

13. Дзігадзюк, В. П. Праспектыўныя адносіны тоеснасці ў прозе У. Гніламёдава / В. П. Дзігадзюк // Актуальные проблемы романо-германской филологии и методики преподавания иностранных языков : материалы XII междунар. науч. конф. (Гомель, 21 окт. 2022 г.) / Гомел. гос. ун-т ; редкол. : Е. В. Сажина (гл. ред.) [и др.]. – Гомель, 2022. – С. 170–175.

14. Дзігадзюк, В. П. Структурны дыяпазон рэтраспектыўных кампанентаў у мастацкай прозе (на матэрыяле твораў У. Гніламёдава) / В. П. Дзігадзюк // Романовские чтения – XVI : сб. ст. Междунар. науч. конф., Могилев, 24 нояб. 2022 г. / Могилев. гос. ун-т ; под общ. ред. А. С. Мельниковой, Е. И. Головач. – Могилев, 2023. – С. 130–131.

МГПУ им. И. П. Шамякина

## РЭЗЮМЭ

Дзігадзюк Валянціна Паўлаўна

**Катэгорыі праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. Гніламёдава**

**Ключавыя словы:** катэгорыі праспекцыі і рэтраспекцыі, маркеры праспекцыі і рэтраспекцыі, праспектыўныя і рэтраспектыўныя адносіны, кампазіцыйна-тэкставая праспекцыя і рэтраспекцыя, мастацкі час.

**Мэта даследавання:** выявіць сістэму моўнай рэпрэзентацыі катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў творах У. Гніламёдава.

**Метады даследавання:** апісальны, дыстрыбутыўны, метад кампанентнага аналізу, нелінейныя прыёмы апісання (табліцы, схемы, дыяграмы), метады колькаснага падліку.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** У дысертацыйным даследаванні метадалагічныя прынцыпы лінгвістыкі тэксту верыфікаваны для аналізу тэкставых катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. Гніламёдава; распрацавана канцэпцыя даследавання моўнай рэпрэзентацыі праспекцыі і рэтраспекцыі; вызначаны тыпы і віды праспекцыі і рэтраспекцыі; зроблены аналіз і сістэматызацыя сродкаў моўнага выражэння праспектыўнай і рэтраспектыўнай прастор з улікам сюжэтна-кампазіцыйных і жанравых асаблівасцей мастацкіх твораў; устаноўлены логіка-семантычныя адносіны паміж праспектыўнымі і рэтраспектыўнымі кампанентамі; выяўлены значэнні камунікатыўнай і мадальна-сэнсавай маркіроўкі праспектыўных кампанентаў; апісаны прыёмы рэпрэзентацыі кампазіцыйна-тэкставай рэтраспекцыі з улікам колькаснага складу яе кампанентаў; вызначана структурная арганізацыя праспектыўных і рэтраспектыўных частак.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні атрыманых вынікаў.** Асноўныя палажэнні і вывады даследавання, а таксама сістэматызаваны, абагульнены і інтэрпрэтаваны фактычны матэрыял могуць быць выкарыстаны пры вывучэнні значэнняў, маркіроўкі, структурнай арганізацыі іншых катэгорый мастацкага тэксту (асобы аўтара, мадальнасці, лакатыўнасці і інш.) і аналізе іх рэпрэзентатыўных адзінак, для стварэння граматыкі беларускай мовы.

**Галіна выкарыстання**: мовазнаўства, літаратуразнаўства, перакладазнаўства, тэксталогія, культуралогія.


МГПУ им. И.П. Шамякина

# РЕЗЮМЕ

Дигадюк Валентина Павловна

**Категории проспекции и ретроспекции в художественной прозе В. Гниломёдова**

**Ключевые слова:** категории проспекции и ретроспекции, маркеры проспекции и ретроспекции, проспективные и ретроспективные отношения, композиционно-текстовая проспекция и ретроспекция, художественное время.

**Цель исследования:** выявить систему языковой репрезентации категорий проспекции и ретроспекции в произведениях В. Гниломёдова.

**Методы исследования:** описательный, дистрибутивный, метод компонентного анализа, нелинейные приемы описания (таблицы, схемы, диаграммы), методы количественного подсчёта.

**Полученные результаты и их новизна.** В диссертационном исследовании методологические принципы лингвистики текста верифицированы для анализа текстовых категорий проспекции и ретроспекции в художественной прозе В. Гниломёдова; разработана концепция исследования языковой репрезентации проспекции и ретроспекции; определены типы и виды проспекции и ретроспекции; сделан анализ и систематизация средств языкового выражения проспективного и ретроспективного пространств с учетом сюжетно-композиционных и жанровых особенностей художественных произведений; установлены логико-семантические отношения между проспективными и ретроспективными компонентами; выявлены значения коммуникативной и модально-смысловой маркировки проспективных компонентов; описаны приёмы репрезентации композиционно-текстовой ретроспекции с учетом численного состава её компонентов; определена структурная организация проспективных и ретроспективных частей.

**Рекомендации по использованию полученных результатов.** Основные положения и выводы исследования, а также систематизированный, обобщенный и интерпретированный значительный фактический материал могут быть использованы при изучении значений, маркировки, структурной организации других категорий художественного текста (образа автора, модальности, локативности и др.) и анализе их репрезентативных единиц, для создания грамматики белорусского языка.

**Область применения:** языкознание, литературоведение, переводоведение, текстология, культурология.


МГПУ им. И.П. Шамякина

## SUMMARY

Digadyuk Valentina Pavlovna

# CATEGORIES OF PROSPECTION AND RETROSPECTION IN V. GNILOMEDOV'S FICTION

**Keywords:** categories of prospection and retrospection, markers of prospection and retrospection, prospective and retrospective relations, compositional-textual prospection and retrospection, fiction time

**The aim of the research is** to identify the system of linguistic representation of the categories of prospection and retrospection in the works of V. Gnilomedov.

**Methods of the research**: descriptive, distributive, component analysis method, non-linear description techniques (tables, charts, diagrams) methods, quantitative calculation methods.

**The results obtained and their novelty**. In the dissertation research, the methodological principles of the linguistics of the text are verified for the analysis of the textual categories of prospection and retrospection in V. Gnilomedov's fiction; the concept of the study of the linguistic representation of prospection and retrospection is developed; the types and subtypes of prospection and retrospection are determined; the analysis and systematization of the means of linguistic representation of prospective and retrospective spaces is made taking into account the plot-compositional and genre features of the literary text; logical-semantic relations between prospective and retrospective components are established; the meanings of communicative and modal-semantic marking of prospective components are revealed; methods of representation of compositional-textual retrospection are described taking into account the number of its components; the structural organisation of prospective and retrospective parts is determined.

**Recommendations on the use of the received results.** The main provisions and conclusions of the study, as well as systematized, generalized and interpreted significant factual material can be used in the study of meanings, marking, structural organization of other categories of literary text (the author’s image, modality, locativity, etc.) and analysis of their representative units, to create a grammar of the Belarusian language.

**The sphere of application:** linguistics, literary studies, translation studies, textology, cultural studies.

МГПУ им. И. П. Шамякина